*УДК [61+615.1](06)(043.2)*
*ББК 5+52.81*
*А 43*
*ISBN 978-985-21-1569-8*


***Санюк Д.А.***

# ЗЛАЧЫНСТВЫ НЯМЕЦКІХ АКУПАНТАЎ НА ТУРАЎШЧЫНЕ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***Научный руководитель: ст. преп. Молчанов П.Ю.***
*Кафедра философии и политологии*
*Белорусский государственный медицинский университет, г. Минск*

У выніку генацыда падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі БССР загінула больш за 2,2 мільёна савецкіх грамадзян. На акупаванай тэрыторыі Беларусі нацысты стварылі больш за 260 лагераў смерці. Нямецкія захопнікі разрушылі і спалілі 209 гарадоў і пасёлкаў, больш за 9200 вёсак. Такі ж лёс напаткаў і жыхароў маёй малой радзімы – Тураўшчыны.

Паводле звестак з архіўных дакументаў, Тураўскі раён быў акупаваны ў жніўні 1941 года і знаходзіўся пад акупацыяй да 5 ліпеня 1944 года. Увесь гэты час нямецка-фашысцкія захопнікі жудасна здзекаваліся з мірных жыхароў раёна. У гарадскім пасёлку Тураў немцы расстралялі, закатавалі і спалілі жывымі 800 чалавек жанчын, старых і дзяцей і вывезлі ў няволю 87 чалавек. На маёй Радзіме ў вёсцы Пагост, якая знаходзіцца на тэрыторыі Азяранскага сельсавета, на пачатку Вялікай Айчыннай вайны было 198 дамоў. Там пражывалі 905 мужчын, жанчын, дзяцей. Але 22 жніўня 1941 года (па іншых звестках 20 жніўня 1941 года) сюды ўварваліся фашысты. Яны спалілі 163 хаты, забілі 50 чалавек (па некаторых крыніцах – 69). 14 чалавек расстралялі і спалілі ў драўлянай хаце, дзе раней быў калгасны дзіцячы сад. Пра гэтыя страшныя падзеі расказала Ільеня Усцінне Дзмітрыеўна, якая цудам засталася жывой. Ёй тады было пяць гадоў. 22 жніўня 2015 года ў вёсцы Пагост устаноўлены помнік з імёнамі ўсіх загінуўшых жыхароў. На адкрыцці помніка Усцінне Дзмітрыеўна расказала, як фашыст забіў яе маці, бацьку, двухгадовага брацiка, маленькую сястрычку і 84-гадовую бабулю. Затым даў дзяўчынцы цукерку, якую яна адштурхнула. Усяго на франтах і ў партызанах загінулі каля 70 жыхароў Пагоста, таксама загінула больш за 80 мірных жыхароў.

Вялікая Айчынная вайна закранула і маю сям'ю. У нашым сямейным альбоме захоўваецца даўні пажаўцелы фотаздымак. Гэты фотаздымак з дакумента, які выдавалі немцы вязням канцлагера. Яго захаваў мой прадзед. На гэтым фотаздымку мой прадзед Паўловіч Цімафей Івановіч (1925 – 2006), яго бацька Паўловіч Іван Самойлавіч (1898 – 1970) і маці Паўловіч Ева Лявонаўна (1902 – 1980). На фотаздымку ў іх на грудзях змешчаны таблічкі з лагернымі нумарамі.

У 1941 годзе ў вёску Аздамічы, дзе яны жылі, прыйшлі немцы. Разам з іншымі аднавяскоўцамі маіх родзічаў насільна вывезлі ў Германію. Спачатку іх прывезлі ў нямецкі горад Пірмазенск. Там іх пераапранулі і павезлі ў горад Людзвігсхафен, дзе яны працавалі на чыгунцы. Затым павезлі ў горад Санбрукін. Там яны працавалі на розных работах. Затым ужо перавезлі ў лагер для ваеннапалонных у горад Найгофін. Прадзед успамінаў, як цяжка працавалі на падземных работах. Працавалі па 16–18 гадзін у суткі, часта галадалі, бо кармілі раз у тры дні. Вызвалілі іх амерыканскія войскі ў маі 1945 года. Пасля вызвалення мая прапрабабуля з прапрадзядулем паехалі дадому, а прадзеда забралі ў армію служыць на тэрыторыі Германіі.

Нельга ўявіць, што было б з нашым народам, калі б задумы злачынцаў здзейсніліся. Мы павінны ведаць усю праўду аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, аб той пагрозе, якая стаяла перад чалавецтвам. Вельмі дарагой цаной дасталася свабода роднай зямлі нашаму народу. На сённяшні дзень у Беларусі на дзяржаўным уліку знаходзяцца 1518 захаранення ахвяр вайны, у якіх пахаваны астанкі больш аднаго мільёна дзяцей і старых, мужчын і жанчын, што падвергліся генацыду. Вайна – гэта вялікі ўрок для ўсяго чалавецтва. Мы не павінны забываць жахі вайны, пакуты і смерць мільёнаў. Трэба памятаць пра гераізм і мужнасць людзей. Змагацца за мір – абавязак усіх, хто жыве на Зямлі. Пакуль мы памятаем пра мінулае, мы захоўваем будучае.